Ніва

Тыднёвік Беларускага грамадска-культурнага таварыства

№ 24 (1059) ГОД XXI 13 ЧЭРВЕНЯ 1976 г. ЦАНА 60 гр.



Большасць з'ездаў Беларускага грамадска-культурнага таварыства адбываецца або напрадвесні, або ў самы разгар вясны. Яны абнаўляюць і пабуджаюць нашу арганізацыю да новага, больш інтэнсіўнага дзеяння, быццам тхненне вясны прыроду. Падкрэсліў гэта старшыня Галоўнага праўлення БГКТ **М. Самоцік,** адкрываючы 30 мая бягучага года VIII з'езд нашай арганізацыі і вітаючы прыбыўшых на яго дэлегатаў і гасцей.

Ранг з'езду падкрэслілі сваёй прысутнасцю старшыня Ваяводскага камітэта ФАН **С. Кудла, сакратар Ваяводскага** камітэта ПАРП **Ю. Пяхоўскі,** прадстаўнік ЦК ПАРП **Ч. Даміноўскі,** дырэктар грамадска-адміністрацыйнага дэпартамента Міністэрства ўнутраных спраў **Е. Зарэмба** і намеснік начальніка гэтага дэпартамента **Е. Хлонь,** візітатар Міністэрства асветы і выхавання **С. Янкоўскі,** дырэктар аддзела ўнутраных спраў Ваяводскага ўпраўлення **Т. Самуль,** старшыня Ваяводскага праўлення ССПМ **В. Далэнгоўскі,** прадстаўнік Ваяводскага праўлення ТППР **Л. Лянчэўскі,** прадстаўнікі іншых палітычных і грамадскіх арганізацый, а таксама працаўнікі радыё і друку. Усіх іх дэлегаты з'езду сустрэлі гарачымі апладысментамі.



З дакладам выступае старшыня ГП БГКТ Мікалай Самоцік.

Згодна з прапановай М. Самоціка з'езд выбірае сваім старшынёю Я. Зенюка. Дэлегацыі моладзі з беларускіх ліцэяў у Бельску і Гайнаўцы ад імя сваіх настаўнікаў і сяброў-школьнікаў зачытваюць прывітанні з'езду і падносяць у прэзідыум букеты бела-чырвонай гваздзікі.

Дэлегаты аднагалосна прымаюць правілы працы і праграму з'езду.

Вялікай групе дзеячоў БГКТ і працаўнікоў „Нівы" сакратар ВК ПАРП Ю. Пяхоўскі і старшыня ВК ФАН С. Кудла ўручаюць дзяржаўныя ордэны і рэгіянальныя ўзнагароды, намеснік дырэктара аддзела культуры і мастацтва Ваяводскага ўпраўлення Т. Самуль уручае дыпломы і грашовыя ўзнагароды, прадстаўнік ВП ТППР Л. Лянчэўскі — дыпломы, а старшыня ГП БГКТ вялікай групе гасцей, прадстаўнікоў супрацоўнічаючых з таварыствам арганізацый і дзеячоў БГКТ — памятныя медалі „20 год БГКТ". Ад імя атрымаўшых дзяржаўныя адзнакі і ўзнагароды дзякуе М. Гайдук.



Прэзідыум VIII з'езду Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

З'езд стварае камісіі: мандатную, прапаноў, выбарчую і статутовую; яны гарантуюць спраўны ход працы найвышэйшага кворума нашай арганізацыі.

Са справаздачным дакладам выступае М. Самоцік.

— Сённяшні VIII з'езд БГКТ мае асабліва вялікае значэнне, — падкрэслівае дакладчык, — паколькі ён заканчвае не толькі мінулы чатырохгадовы перыяд дзейнасці, але і з'яўляецца кульмінацыйным пунктам адзначэння 20-годдзя нашай арганізацыі.

І ён засяроджвае ўвагу на мінулым 20-годдзі БГКТ — перыядзе шматлікіх ініцыятыў, пошукаў найбольш эфектыўных форм дзейнасці, стварэння матэрыяльнай базы для дзейнасці нашай арганізацыі, падрыхтоўкі актыву да выканання задач, пастаўленых перад БГКТ. У гэтай справе найбольш эфектыўную дапамогу аказаў наш орган — штотыднёвік „Ніва", тыраж якога з кожным годам узрастае, цяпер даходзіць да 8 000 экземпляраў і трапляе ў 13 краін свету. Іменна „Ніва" адыгрывае ролю дзейснага прапагандыста, арганізатара і кворума абмену вопытам у нашай культурна-асветнай дзейнасці. З яе старонак пачынаюць свой радавод літаратурнае аб'яднанне „Белавежа" і навуковы гурток БГКТ. „Ніва" і „Зорка" — гэта надзённыя дапаможнікі ў навучанні роднай мовы ў школах ды любві і пашаны да ўсяго роднага ва ўсіх беларускіх асяроддзях Народнай Польшчы. Успамагае „Ніву" беларускае друкаванае слова з 45 кніжных выданняў, якія выпусціла БГКТ у мінулыя 20 год агульным тыражом у 150 тысяч экземпляраў. Наша арганізацыя вядзе шырокую прапагандысцка-лектарскую працу, на яе рахунку ёсць каля 3000 дакладаў і гутарак, 6000 фотавыставак, 1800 аўтарскіх сустрэч і 3 500 урачыстых вечарын, вечароў адпачынку і фэстынаў. Гэтая велічная колькасць мерапрыемстваў датычылася тэмаў міжнароднай сітуацыі, дасягненняў Народнай Польшчы і СССР, сучаснасці і мінулага БССР, гісторыі польска-беларускіх культурных сувязей і інш. Велізарную работу правяло БГКТ у справе разбуджэння мастацкай самадзейнасці, у гісторыі БГКТ кожная другая вёска ў беларускім асяроддзі мела свой калектыў, а шэраг з іх дало па некалькі соцень выступленняў, як напрыклад, славутая „Лявоніха" (звыш 2000 канцэртаў), гарадоцкі калектыў (звыш 600 канцэртаў), актыўна працуюць калектывы з Бельска, Белавежы, Дубяжына, Беластока, Плёскаў і дзесяткі іншых. Фэстыны БГКТ сталі агульнанароднымі святамі і трывала ўпісаліся ў культурны ландшафт Беласточчыны. Наша таварыства наладзіла цеснае супрацоўніцтва з многімі іншымі грамадскімі і маладзёжнымі арганізацыямі і, такім чынам, мае надзейных саюзнікаў у сваёй дзейнасці. Справы вывучэння беларускай мовы ў пачатковых школах, стварэнне кафедры беларускай філалогіі ў Варшаўскім універсітэце, пашырэнне чытальніцтва беларускіх кніг і часопісаў і дзесяткі іншых дзялянак і

(Працяг на стар. 2)

ГАЛОЎНАЕ ПРАЎЛЕННЕ БГКТ

Іван Алексеюк
Тамара Алексеюк
Анна Амбражэй
Аляксандр Баршчэўскі
Аляксандр Башко
Георгі Валкавыцкі
Анна Васілюк
Мікалай Гайдук
Хведар Галёнка
Вольга Гарустовіч
Міхась Гацута
Янка Зенюк
Аляксандр Іванюк
Анна Ігнацюк
Генадзь Казлоўскі
Аляксандр Каленік
Аляксей Карпюк
Юрка Кіслы
Мікалай Куптэль
Міхась Кучка
Валянціна Ласкевіч
Віталіс Луба
Сяргей Лукашук
Валянціна Мароз
Анатоль Мартыновіч
Сяргей Мартыновіч
Іосіф Навіцкі
Уладзімір Паўлоўскі
Мікалай Пашкоўскі
Мікалай Раманюк
Аляксандр Рафаловіч
Віталіс Садоўскі
Хведар Садоўскі
Мікалай Самоцік
Вінцук Склубоўскі
Уладзімір Сцепанюк
Мікалай Суліма
Галена Тапалянская
Сцяпан Трафімюк
Мікалай Хлябіч
Софія Цацэрка
Ніна Цыванюк
Эдуард Шафаловіч
Віктар Швед
Уладзімір Юзвюк

ПРЭЗІДЫУМ ГП БГКТ

Мікалай Самоцік — старшыня
Георгі Валкавыцкі — намеснік старшыні
Янка Зенюк — сакратар
Аляксандр Баршчэўскі — член
Аляксандр Іванюк — член
Аляксандр Рафаловіч — член
Вінцук Склубоўскі — член
Сцяпан Трафімюк — член
Ніна Цыванюк — член

ГАЛОЎНАЯ РЭВІЗІЙНАЯ КАМІСІЯ

Міхась Хмялеўскі — старшыня
Сымон Шыманюк — намеснік старшыні
Тамара Рачкевіч — сакратар
Васіль Антышок — член
Уладзімір Навіцкі — член



У зале VIII з'езду Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

Пачатак на стар. 1

VIII з'езд БГКТ

спраў, што датычыліся культуры і асветы ў беларускім асяроддзі, — усё гэта стаяла на парадку дня дзейнасці БГКТ. Зразумела, не ўсе яны вырашаліся паспяхова.

Усе дасягненні БГКТ выраслі на глебе агульных дасягненняў у сацыялістычным будаўніцтве ў Народнай Польшчы.

Старшыня Галоўнай рэвізійнай камісіі М. Хмялеўскі ў прадстаўленай з'езду справаздачы, адзначаючы станоўчыя бакі ў дзейнасці ўступаючага Галоўнага праўлення і Прэзідыума БГКТ, указаў таксама і на недахопы. Аднак, як сцвердзіў М. Хмялеўскі, на працягу 4 год працы Галоўнае праўленне і яго Прэзідыум не мелі ў сваёй дзейнасці якіх-небудзь няправільнасцей і парушэнняў статута БГКТ, і таму Галоўная рэвізійная камісія запрапанавала дэлегатам адобрыць дзейнасць уступаючага ГП БГКТ.

У міжчасе ў прэзідыум з'езду ўплылі віншавальныя тэлеграмы ад студэнтаў і выкладчыкаў кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, шматлікіх гурткоў БГКТ з Гайнаўшчыны, ад Галоўнага праўлення Літоўскага ГКТ і іншых арганізацый.

Ад імя экзекутывы ВК ПАРП і I сакратара ВК ПАРП, ваяводы беластоцкага і Ваяводскага ўпраўлення, ад ВК ФАН высокую ацэнку дзейнасці нашай арганізацыі выказаў у сваім выступленні сакратар ВК ПАРП Ю. Пяхоўскі. Пазнаёміў ён таксама з'езд з асноўнымі напрамкамі развіцця Беласточчыны ў будучыні. У так званым другім беластоцкім паскоранні наша ваяводства будзе канцэнтраваць увагу на: 1) павелічэнні вытворчасці харчавання (перш за ўсё малака і мяса) і тавараў на рынак, 2) спецыялізаваным будаўніцтве (прамысловым, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, стальных канструкцый і т.п.), 3) умацоўванні і пашырэнні ў горадзе Беластоку цэнтра вышэйшых навучальных устаноў і навуковых даследаванняў з абсягам на іншыя паўночна-ўсходнія ваяводствы, 4) стварэнні адпаведнага базіса для турызму і адпачынку. Дзякуючы самаахвярнай працы ўсіх жыхароў Беласточчыны, у тым ліку таксама і беларусаў, наша ваяводства напэўна зойме важнае месца ў грамадскім і гаспадарчым развіцці краіны.

Тав. Ю. Пяхоўскі паведаміў таксама з'езду, што Ваяводская рада нарадовая ў Беластоку ўзнагародзіла „Ніву" залатым знакам „Заслужаны для Беласточчыны".

З прывітаннямі з'езду і ўсёй нашай арганізацыі выступілі: Ч. Даміноўскі ад Цэнтральнага камітэта ПАРП, С. Янкоўскі ад Міністэрства асветы і выхавання, Е. Зарэмба ад Міністэрства ўнутраных спраў, В. Далэнгоўскі ад Ваяводскай федэрацыі саюзаў моладзі. У дыскусіі прынялі ўдзел: А. Іванюк, А. Баршчэўскі, Я. Аніська, В. Антыпюк, В. Швед, А. Красько і В. Рудчык. Яны закраналі найбольш істотныя праблемы з жыцця нашай арганізацыі. (Матэрыялы па дыскусіі будуць апублікаваны ў наступных нумарах „Нівы").


Старшыні паасобных камісій прадставілі з'езду апрацаваныя імі дакументы. Была сцверджана правамоцнасць VIII з'езду (з 148 выбраных дэлегатаў у з'ездзе прыняло ўдзел 106). З'езд прыняў прыстасаваны да новай структуры нашай арганізацыі статут БГКТ і прапановы для далейшай дзейнасці таварыства. З'езд выбраў склад новага ГП БГКТ у ліку 45 асоб і Галоўнай рэвізійнай камісіі — 5 асоб.

У часе перапынку на першых сваіх пасяджэннях Галоўнае праўленне выбрала Прэзідыум ГП БГКТ, а Галоўная рэвізійная камісія — свайго старшыню.

— Заданні ўсім нам ясныя, работы ў нас многа, — падкрэсліў старшыня ГП БГКТ М. Самоцік у заключным слове. — Мы будзем у сваёй дзейнасці звяртаць увагу не толькі на выконванне сваіх статутовых абавязкаў, але і ўсіх агульнанародных планаў, а ў іх ліку і нашага беластоцкага паскорання, у здзяйсненні ўсяго таго, над чым працуе ўвесь наш край.

Працавіты і плённы дзень з'езду закончылі выступленні гарадоцкага хору.

Ігнат Снарскі
Фота *З. Лянкевіча*



Беларускія гарады. Віцебск, Плошча свабоды. Фота Э. Трыгубовіча.

ПА-СУСЕДСКУ МЫ ЖЫВЕМ

Калі думаю аб узаемаадносінах паміж намі — грамадзянамі сацыялістычнай Польшчы і нашымі ўсходнімі суседзямі, чамусьці заўсёды прыпамінаецца мне папулярная песня:

По-соседски мы живём,
Наши окна друг на друга
Смотрят вечером и днём...

Сапраўды, не толькі вокны і дзверы ў нас наўсцяж, але таксама са шчырымі пачуццямі адкрываем мы сэрцы, каб выказаць сваю любоў, і па-сяброўску працягваем рукі, каб дружалюбным поціскам засведчыць нашу еднасць.

Апошнія месяцы, асабліва перыяд ад VII з'езду ПАРП і XXV з'езду КПСС, былі багатыя шматлікімі кантактамі ў прыгранічнай паласе, ужо не ўспамінаючы пра агульнавядомыя сяброўскія сустрэчы на самым высокім партыйным і дзяржаўным узроўні. Нават мне асабіста даводзілася гутарыць з многімі прадстаўнікамі савецкіх дэлегацый з Гродна, Зельвы, Ліды, Барысава, Брэста, Каўнаса, Вільнюса і з іншых гарадоў Беларусі і Літвы, якія наведвалі беластоцкую зямлю. Уражанне ад гэтых гутарак і сустрэч асталося адно: **жывем мы па-суседску і ўсё нас яднае.**

Аднак найбольш поўна ідэю польска-савецкай дружбы прадстаўляе **Таварыства польска-савецкай дружбы.** Яно, між іншым, тут на Беласточчыне і пачынала сваю дзейнасць.

І таму я звярнуўся да старшыні Ваяводскага праўлення ТППР у Беластоку **Яна Сохі** з просьбай, каб ён расказаў нам аб дасягненнях ТППР на Беласточчыне ў галіне ўмацавання польска-савецкай дружбы.

— Таварыства польска-савецкай дружбы, — заявіў найперш таварыш Соха, — з'яўляецца вельмі важнай састаўной часткай грамадска-палітычнага жыцця Беласточчыны. **Нашы гурткі дзейнічаюць ва ўсіх гмінах, ва ўсіх установах і** прадпрыемствах. **Вядуць** яны актыўную грамадскую дзейнасць. На тэрыторыі цяперашняга Беластоцкага ваяводства наша арганізацыя налічвае звыш 55 тысяч членаў, аб'яднаных у 600 гуртках. Адначасова ёсць 300 калектыўных членаў ТППР.

Галоўным заданнем членаў нашай арганізацыі з'яўляецца ўмацаванне польска-савецкай дружбы. Дасягаем мы гэтай мэты самымі рознымі спосабамі. Найбольш плённымі ды павучальнымі з'яўляюцца асабістыя кантакты. Выдатна разумеем мы гэта і стараемся падобныя кантакты наладжваць як мага часцей. Вось для прыкладу, на працягу двух апошніх гадоў наша ваяводская арганізацыя наладзіла ў Савецкі Саюз ужо тры **„Цягнікі дружбы"** і каля **сарака турыстычных груп. Такім чынам, аж 1600 нашых актывістаў магло на ўласныя вочы паглядзець, як жывуць нашы сябры за ўсходняй мяжой, як яны працуюць, чым цешацца, які ў іх вопыт.**

— Калі я ўжо ўспомніў аб нашых грамадскіх актывістах, — адзначыў тав. Ян Соха, — дык трэба вам ведаць, што іх у нас вельмі многа, лічым іх на тысячы чалавек. Гэта людзі адданыя, верныя нашай вялікай справе, гэта людзі, якія не дзеля нейкай асабістай нажывы, але з глыбока закаранёнай патрэбы сэрца служаць нашай ідэі, ідэі польска-савецкай дружбы.

— Цяпер наша арганізацыя, — закончыў тав. Ян Соха, — лічыць сваім асноўным абавязкам распаўсюджваць гэтыя вялікія і першапланавыя праблемы нашага часу, якія разглядалі XXV з'езд КПСС і яшчэ крыху раней — VII з'езд нашай партыі.

Успомнілася мне Кузніца — гэты маленькі пагранічны пасёлак. Быў я там тады, калі з нагоды XXV з'езду КПСС праходзіў у мясцовым доме культуры шматлюдны мітынг дружбы з удзелам прадстаўнікоў суседняй Гродзеншчыны. У час перапынку „на перакур" звярнуўся я да аднаго з гродзенскіх рабочых хімічнага камбіната імя Сяргея Прытыцкага, які якраз заняты быў гутаркай з прадстаўніком фабрыкі будаўнічай сталяркі ў Саколцы — таксама імя Сяргея Прытыцкага.

— Што я мяркую аб нашай дружбе? — паўтарыў ён маё пытанне. — А што ж мне меркаваць? Яна нармальная, звычайная, як наша жыццё. Вось я заняты па вытворчасці капралактану, а мой таварыш робіць вокны. А разгаварыліся мы, і, аказваецца, у нас многа спраў агульных, супольных, бо штодзённае жыццё ў нас падобнае...

Другі раз пабываў я ў Кузніцы зусім нядаўна. Быў звычайны буднішні дзень, здаецца, чацвер.

— Што ў вас чуваць? — звярнуўся я да афіцэра пагранічнай кантрольнай службы.

— А вось бачыце, — паказаў ён цягнік з савецкімі распазнавальнымі знакамі, які толькі што спыніўся ля чыгуначнай стаянкі. — Каля 600 чалавек прыбыло гэтым цягнікам. Трэба спяшацца, каб хутчэй прыняць гасцей, каб дазволіць ім адправіцца ў розныя куткі краіны, дзе чакаюць іх сваякі, знаёмыя, сябры...

І так кожны дзень. Сустракаем іх з адкрытым сэрцам.

Віктар Рудчык

З АДКРЫТЫМ СЭРЦАМ

TELEWIZJA WARSZAWA

Sobota 12.VI. 6.00 Tech. Rol. Wskaz. met. 6.30 Mat. 10.00 Zegnajcie gołębie — film fab. radz. 13.45 Tech. Rol. Wskaz. met. 14.30 Mat. 15.40 Pr. I prop. 15.55 Pr. dnia. 16.00 Dzien. 16.10 Obiektyw. 16.30 Za kierownicą. 16.50 Sport. 18.30 Fest. Pios. Radz. KONCERT PRZYJAŹNI. 19.20 Dobr. 19.30 Monitor. 20.20 Teatr Komedii: Klara Feher — Wystarczy jeden telefon. 21.30 Dzien. 21.50 Fest. Pios. Radz. RADZIECKIE PRZEBOJE FILMOWE. 22.50 Sport. 23.05 Rowery z Belsize — film rozr. belg. 23.30 Opow. Star. Pana.

— ■ —

Niedziela 13.VI. 6.25 Tech. rol. Wskaz. met. 6.55 Mat. 7.25 Kurs Rol. 8.00 Przyp., radz. 8.10 Now. w domu i zagr. 8.35 Bieg po zdr. 8.50 Pr. dnia. 8.55 Sport. 9.00 Kino Najmłodszych. 9.30 Antena. 9.50 Przemysław i Judyta — film fab. CSRS. 11.10 W partyzantce na Białorusi — film dok. 11.45 Dzien. 12.05 Polak w Bagdadzie — film dok. 12.30 Teleturniej. 13.30 Bezkresne horyzonty Amazonii — film dok. 15.00 Widowisko muz. 16.00 Los. Duż. Lotka. 16.15 Piórkiem i węgl. 16.40 Refl. ob. 16.55 Sport. 18.15 Fest. Pios. Radz. KONCERT LAUREATÓW. 19.15 Wieczor. 19.30 Dzien. 20.20 Bajka dla dor. 20.30 Proch i kula — film ser. fr. 21.25 Fest. Pios. Radz. ZAWSZE NIECH BĘDZIE SŁOŃCE. 22.25 Sport.

— ■ —

Poniedziałek 14.VI. 12.45 Tech. Rol. J. pol. 13.25 Mat. 14.40 Politech. Kurs przygot. Mat. 15.15 Fiz. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Echo stad. 17.50 Igła Galileusza — film ser. bułg. 18.50 Mam pomysł. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.10 Sport. 20.25 Teatr TV: Faust. 22.15 Dzien. 22.30 Pr. publ.

— ■ —

Wtorek 15.VI. 6.00 Tech. Rol. J. pol. 6.30 Mat. 9.00 Proch i kula — film ser. fr. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Przed ekr. 17.30 Wielka woda. 18.05 Stud. Mł. 18.55 Pr. publ. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Sport. 20.25 Przyp., radz. 20.30 Paryscy Mohikanie — film ser. czech. 21.20 Świat i Polska. 22.05 Dzien. 22.29 Pr. muz.-balet. 22.45 Lek. Pegaza.

— ■ —

Środa 16.VI. 9.00 Paryscy Mohikanie — film ser. czech. 12.45 Tech. Rol. J. pol. 14.40 Politech. Kurs przygot. Fiz. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.10 BLOK TARGOWY. Od jarmarku do targów. 19.05 Rewia Targowa. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Finał Mistrz. Europy w p. nożnej. 22.00 Dzien. 22.15 Róże od pana Reinhardta — film ang. 23.05 Pr. rozr.

— ■ —

Czwartek 17.VI. 6.00 Tech. Rol. J. pol. 8.55 Pr. dnia. 9.00 Dla mł. widzów: Trzy orzeszki dla Kopciuszka — film fab. czech. 10.25 W starym kinie. 11.35 Klub Sześciu Kont. 12.35 Studio Montreal 76. 13.05 Wielka gra. 14.05 XYZ — cz. II. 14.35 Konkurs Eurowizji 76. 15.30 Pegaz. 16.00 Operowe Qui Pro Quo. 17.00 Wszystko za wszystko. 18.20 Podróż detektywa — film ser. ang. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Finał Mistrz. Europy w p. nożnej. 22.00 Dobry wieczór — tu Łódź.

— ■ —

Piątek 18.VI. 9.00 Podróże detektywa — film ser. ang. 14.40 Politech. Kurs przygot. Mat. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.10 Inf. Wyd. 17.25 Patrol. 17.50 Pr. publ. 18.20 Przez maskę płetwonurka — film dok. fr. 18.45 Eureka. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Sport. 20.25 Teatr Małych Form: I. Iredyński — Niemowa. 21.00 Drogowskazy. 21.45 Dzien. 22.00 Żywoty instrumentów.

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek 11.VI — 8.40 Film fab. 14.05 Film fab. 17.30 Święto poezji. 19.30 Spotkanie zesp. Teatru Wielkiego z przodown. pracy.

Sobota 12.VI — 9.30 Koncert. 10.45 Koncert. 11.15 Film fab. 14.25 Filmy anim. 15.00 Nie do wiary. 16.15 P. nożna. Dynamo (Tbilisi)—Karpaty (Lwów). 18.20 Filmy z Chaplinem. 19.30 Koncert estrad. 21.00 Mistrz. ZSRR w L. atletyce.

Niedziela 13.VI — 11.30 Film fab. 12.50 Balet. 14.20 Koncert życzeń. 15.00 Panorama międzynar. 15.30 Filmy anim. 16.15 Film fab. 18.00 Klub film.

KINO

Białowieża Pojedynek na szosie — USA. 15—16. BS 38-15 — NRD. 17—18. Dulscy — pol. 19—20.

Czeremcha Dramat namiętności — kanad. 15—16. Spragniona miłości — buł. 19—20.

Dubicze Cerkiewne Miasto niezwykłe Warszawa — pol. Żeglarz znad Dunaju — węg. 16—20.

Gródek Pojedynek na szosie — USA. 19—20.

Kleszczele Wakacje we czworo — wł. 15—16. Swój wśród obcych, obcy wśród swoich — radz. 17—18.

Michałowo Noce i dnie — pol. 15—20.

Mielnik Niespokojne morze — czes. 16. Noce i dnie — pol. 19—20.

Milejczyce Łobuz — fr. Wilk morski — rum. 15—20.

Narew Rodzinny gang — wł. Trzej świadkowie — czes. 16—20.

Narewka No i co doktorku — USA. Legenda o Paulu i Pauli — NRD 16—20.

Nurzec Telegram — radz. 15—16. Śmiech w ciemności — ang. 17—18. Pięć łatwych utworów — USA. 19—20.

Orla Doktor Judym — pol. Gniewna podróż — buł. 16—20.

Rajsk To ja zabiłem — pol. Manewry Dniepr — radz. 16—20.

B.Z.Graf. Zam. 1351 F-2

Арэшкаўскі фэстын

У бягучым годзе народныя фэстыны БГКТ, якія арганізоўвае Беларускае таварыства, будуць праходзіць пад лозунгам XX гадавіны БГКТ. Першая такая ўрачыстасць адбылася ў вёсцы Арэшкава, што ў Гайнаўскай гміне. Гаспадаром святкавання юбілейнай даты быў мясцовы гурток нашай арганізацыі, які ўзначальваецца Нінай Аверчук. Арэшкаўцы моцна рыхтаваліся да фэстыну, які тут меў адбыцца ўпершыню. Неаднойчы жанчыны (гурток БГКТ у гэтай вёсцы ў асноўным складаецца з жанчын — членаў гуртка вясковых гаспадынь) абмяркоўвалі, як правесці свята, каб было яно на высокім узроўні. Мясцовая фальклорная жаночая харавая група падрыхтоўвалася да выступлення, рыхтаваліся спартыўныя ігры. Пад кіраўніцтвам настаўніц рыхтаваўся таксама школьны мастацкі калектыў. І мужчыны папрацавалі, рыхтуючы самаходныя прычэпы, якія былі трыбунай і сцэнай для фэстына. Вялікую дапамогу ў арганізацыі фэстына аказаў раённы дом культуры ў Гайнаўцы, а перш за ўсё Альжбета Цаглярская, і інструктар ГП БГКТ Віктар Бура.

23 мая ўжо з самай раніцы пачалі прыязджаць ГС-аўскія самаходы з харчамі, напіткамі і марожаным. Прыехалі мастацкія калектывы і прадстаўнікі ўлад. Сабралася не менш тысячы чалавек, якія прыбылі нават з далёкіх вёсак. На школьным пляцы прыгожа выглядала трыбуна, якая абсаджана была бярозкамі, ля якіх былі вялікія чырвоныя і бела-чырвоныя палотнішчы. А далей паміж імі відаць быў надпіс „20 год БГКТ“. Непадалёку ад трыбуны, на сталах, разложаны былі кніжныя выданні ГП БГКТ, на якія было шмат пакупнікоў.

А 12 гадзіне распачалася афіцыйная частка. Адкрыў яе начальнік Гайнаўскай гміны Юрый Буйноўскі, які ў кароткай прамове падкрэсліў значэнне юбілейнай даты БГКТ, заслугі вёскі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і заслугі арэшкаўскіх жанчын у развіцці мастацкай самадзейнасці. З дакладам аб дваццатай гадавіне Беларускага таварыства выступіў старшыня Галоўнай рэвізійнай камісіі Міхась Хмялеўскі.

Затым на сцэну — трыбуну ўвайшлі арэшкаўскія школьнікі, якія выканалі па некалькі беларускіх, польскіх і рускіх песень. А паміж песнямі выступалі вучні з вершамі. Дэкламавалі даволі добра. Асабліва ўзрушаны быў ад гэтых вершаў прысутны на фэстыне наш паэт Віктар Швед, вершы якога прадстаўлены былі і ў песні, і ў дэкламацыі. Пасля школьнікаў выступала мясцовая жаночая фальклорная група, якая атрымала шмат гарачых апладысментаў за свае старадаўнія песні.

Многа сардэчнага смеху выклікала панадворкавая капэла з Гайнаўкі, якая пад уласную музыку спявала вясёлыя сатырычныя і народныя песні.


Захапіў сваім мастацтвам калектыў песні і танца з Белавежы „Белавежа“, які працуе пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашука і Янкі Крупы. Музычны калектыў гарадскога гуртка БГКТ з Беластока і перад афіцыйнай часткай і пасля ўсіх калектываў трыумфаваў на сцэне. Іграў ён і тады, калі адбываліся спартыўныя футбольныя спаборніцтвы спецыфічных каманд. Спаборнічалі паміж сабой жанатыя з нежанатымі, а пасля хлопцы з дзяўчатамі. Цікавая была гэта ігра. Надвячоркам распачалася танцавальная вечарына.

Арэшкаўскія жанчыны не адпусцілі запрошаных прадстаўнікоў улад, пакуль не пачаставалі ўласнай кулінарыяй і не распыталі пра ўражанні аб фэстыне. Сакратар гміннага камітэта ПАРП у Гайнаўцы Іван Скепка высока ацаніў выхаваўчы змест фэстына БГКТ, старшыня ГП БГКТ Мікалай Самоцік падкрэсліў высокі арганізацыйны ўзровень фэстына, а Альжбета Цаглярская выказала вялікае задавальненне з таго, што якраз у дзень дзеяча культуры адбывалася гэта грамадска-культурнае мерапрыемства, якое яшчэ раз падкрэсліла добрае развіццё культуры ў беларускім асяроддзі.

Тэкст і фота **Міхася Сваяка**




Арэшкаўскі хор.



Спявае „Белавежа“.



Панадворная капела з Гайнаўкі.



Спартыўныя спаборніцтвы.



ГС памог харчамі.



Выступаюць мясцовыя школьнікі.

Боцькі поўныя фальклору

Боцькі... Прыгожая назва. Ці ж не ўстае адразу ў вашых вачах рад пакрытых саломай стадол з вялізнымі, разлажыстымі, поўнымі павагі буслінымі гнёздамі, з якіх разліваецца над узятай у палон вясны зямлёй залівістае клекатанне гэтых чырвонаногіх, з доўгімі дзюбамі, легендарных птушак? Так, чароўная прыгажосць. Але цяпер няма ані саламяных стрэх, ані такой колькасці бусліных гнёздаў... Затое большасць розных назваў звязана з гэтай птушкай. Вось хаця б рэстаран, які назвалі „Бусел“. Або песенны калектыў, які нядаўна ўзнік і якому далі імя „Клекацякі“...

Песенныя калектывы з фальклорным рэпертуарам — гэта ўжо ў Боцьках традыцыя. Даволі многа іх тут было. Адны распадаліся, другія ўзнікалі. Год 1960. Нарадзіўся тады калектыў народнай песні. Хутка яго склад павялічваўся, і дайшло да 25 асоб. Мелі свае інструменты: 6 мандалін, 6 гітар і адзін акардэон. Пад кіраўніцтвам Гэнавефы Луц'ян — жанчыны поўнай арганізацыйных здольнасцей, якая зараз з'яўляецца дырэктарам мясцовага клуба культуры, зайшлі даволі высока. Выступалі не толькі ў сябе, але і ў іншых мясцовасцях. У сувязі з рознымі святамі запрашалі іх у розныя гарады.

— І так было да 1965 г. — гаворыць Г. Луц'ян. — Потым людзі пачалі цікавіцца музыкай сучаснай.

Гэта быў канец. Разляцелася. Мікалай Турковіч — таленавіты акардэаніст калектыву спрабаваў яшчэ нешта зрабіць. Стварыў ён невялічкую групу „Фіглярныя дзяўчаты“, якая праіснавала, бадай, да 1969 г. і распалася. М. Турковіч перайшоў у Бельск і распачаў працу з „Ютшэнкай“ і „Падляшскімі кукулкамі“ .

У Боцьках, здавалася, ужо нічога не будзе. Але ж не. Стварaліся там розныя невялічкія калектыўчыкі. Аднак былі гэта свабодна існуючыя групкі. Вось хаця б „Каляднікі“, дзейнасць якіх была цесна звязана са святам каляд. Хадзілі ад хаты да хаты і калядавалі. Падтрымоўвалі традыцыю. Былі гэта найчасцей людзі старэйшыя, нават такія, якім было за 65 год. Дзейнічалі таксама і другія фальклорныя групы. І вось у Кольне быў арганізаваны агляд народных калектываў. Выступілі і Боцькі. Гэта і быў штуршок да ўзнікнення „Клекацякаў“, якім ужо каля паўтара года і ў склад якіх уваходзіць 15 асоб. Кожны з іх мае музычны інструмент. Калі пры інструментах, то ёсць тут акардэоны, скрыпкі і „Марына“. Што ж гэта за „Марына“? Гэта тыпова народны інструмент, напамінаючы жанчыну, апранутую ў каляровую вопратку. Замяняе ён барабан.

Сваім даволі добрым стартам зацікавілі наваколле. Запрашаюць іх на розныя святы. Прымаюць яны ўдзел у розных аглядах. Рэпертуар, зразумела, фальклорны. Самі запісваюць ад старэйшых людзей песні, самі падбіраюць гумар. Потым усё гэта апрацоўваюць і складаюць праграму. Сваёй дзейнасцю „Клекацякі“ заахвоцілі і „Каляднікаў“, якія таксама дабіліся вялікіх поспехаў. Вось у 1975 годзе ў Беластоку на аглядзе падобных ім калектываў, занялі яны першае месца.

Каб не былі гэта толькі сухія паведамленні, то можа возьмем нешта з іхняй праграмы. Што? Давайце вяселле. Простае народнае вяселле, якое падрыхтавалі сумесна з „Ютшэнкай“, „Падляшскімі кукулкамі“ і клубам селяніна ў Якубоўскіх 9 мая бягучага года з нагоды Дня перамогі і Дзён культуры, асветы, кніжкі і друку. Было гэта традыцыйнае падляшскае вяселле з народнымі песнямі, абрадамі, стравамі. Адбыўся нават падзел каравая. Былі таксама ўведзены і вясельныя чыны.

Другая рэч, якой прысвячаюць многа часу, — гэта „Нядзельны ярмарак“, у якім ужо выступалі. Цяпер чакаюць толькі вынікаў, ад якіх залежыць, ці пяройдуць да другой часткі конкурсу, ці не.

М. Шаховіч

Маёй званіцы

ЯКОЕ ЖЫЦЦЁ

Ой, жыццё, жыццё! Адзін гаворыць, што вельмі цікавае, другі ганіць, а на самай справе, дык цяжка і разабрацца. Падумайце, калісь, як я пазнаёмілася са сваім Марцінам, дык здавалася, што ў свеце другога такога няма. Ён, бывала, як заспявае, затанцуе, як прыкажа, то аж сэрца трапечацца ад радасці. Ягона маці заўжды гаварыла: „Міхалінка, як пойдзеш за Марціна, то ён цябе азалоціць. Ён жа ў мяне, як гаспадыня, кароў падоіць, хлеб спячэ, а нават і курэй пашчупае". Я сардэчна ўсміхнулася і падумала: „Эх, курэй то я і сама магу пашчупаць, ён чым другім зоймецца".

Так мы, знаеце, і пажаніліся. Усё жыццё мой Марцін мне дапамагаў, але што ж, цяпер усё па-новаму, а ён слаба пісьменны і цяжка стала. Як пачне штосьці варыць, бярэ кулінарную кніжку і пакуль рэцэптуру прачытае, то ўсё або выкіпіць, або прыгарыць. Аднойчы, пакуль прачытаў, колькі дадаць часнаку да катлетаў, то суседаў кот цераз акно ўсё мяса павыносіў. Цяжка, ведаеце, цёмнаму чалавеку.

Гэта яшчэ мяне так не знервавала, пакуль вялікае дурнаты не ўпароў. Хто ж гэта бачыў, быць такім дурнем? Кансервавалі мы агурочкі. Цэлы мяшок мне дачка Паланея прывезла. Памыла я вэкі, агурочкі перабрала, паклала ў вэкі і кажу, што на кожны слоік паводле гэтае кніжкі дасі прыправы і залееш. Пасля варыць яму сказала амаль цэлых 20 мінут. Відома, мусіш дапільнаваць, бо гэта ўсё на вяселле нашае Прузынкі — наймалодшае дачушкі. Сама паехала ў Беласток, а ён пачаў работу. Вярнулася, і аж сэрца зарадавалася, калі ўбачыла 64 слоікі з агуркамі. Ад радасці пацалавала яго ў лысы лоб і падумала: „Аднак золата-мужык". Аб блеску гэтага золата даведалася не толькі я, але і ўсе вясельнікі. Можа не паверыце, але шчырую праўду кажу. Падалі мы агуркі на вясельныя сталы, а яны выглядалі — цуда. Кожны схапўся, як за какосавы арэх, і ўсе пачалі плюваць. Калі я папробавала, то амаль не самлела. Агуркі без смаку. Пры гасцях старога слоікам у тую мазгаўню стукнула і, падумайце, акурат у тое месца, дзе калісь пацалавала. Божышча, што зрабіў згодна з рэцэптам, а пасля выяснілася, што ўсе прыправы ён паклаў на брудныя слоікі і так варыў. Столькі затрат і сораму, што кожнаму з вас вядома. Раю вам, сябровачкі, — не спадзявайцеся на мужчын, бо з імі нікоці нічога не вядома.

З паважаннем напоўненая сорамам **Суседка Міхаліна.**

Беларускія кнігі

У кнігарні імпартных выданняў у Беластоку, вул. Кілінскага 10, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Ткачоў Васіль, Хітры Данік, 1975, стар. 30, цана 70 гр.

Зборнічак займальных апавяданняў для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

Дзяржынскі Авяр'ян, Каласок, 1975, стар. 48, цана 3 зл. 90 гр.

Зборнік вершаў і казак з каляровымі малюнкамі Я. Жыліна. Вельмі добры падарунак для дзетак-малалетак!

Агняцвет Эдзі, Краіна маленства, 1975, стар. 96, цана 2 зл. 30 гр.

Кніжка выбраных вершаў і паэм („Песня пра піянерскі сцяг", „Навальніца над Сожам", „Незвычайныя канікулы") вядомай беларускай паэтэсы, што піша для малых чытачоў. Артыкул аб яе творчасці належыць пяру М. Барстока.

Разумная дачка, 1975, цана 1 зл. 30 гр.

Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча і з каляровымі ілюстрацыямі У. Савіча.

Песні на словы А. Русака, 1975, стар. 48, цана 3 зл. 40 гр.

Выбраныя, найбольш папулярныя песні з нотамі на словы паэта-песенніка А. Русака для сольнага і харавога спеву пад акампанемент баяна ці фартэпіяна. Даскаалая рэч для наших самадзейнікаў!

Мінск, 1975, цана 57 зл. 90 гр.

Элегантны альбом з каляровымі і чорна-белымі фотаграмамі. Артыкул аб мінулым і сучасным сталіцы БССР пяра Т. Хадкевіча на беларускай, рускай і англійскай мовах.

Кнігарня ахвотна высылае кнігі за паштовым заліччэннем. Запатрабаванні кіруйце па адрасу: „Dom Książki" 15-089 Białystok, ul. Kilińskiego 10. **(мг)**

Ад родных ніў

Гэта рубрыка для народных творцаў. Адкрываем яе з перакананнем, што будзе яна творчым палеткам для прарастання самародных талентаў, якімі багата наша зямля. У гэтай рубрыцы не будуць абавязваць літаратурныя моды. Тут будзе крынічная паэзія ў непрыкрытым выглядзе.

ВАРОЧАЛКА

Варочалка, варочалка, —
Між калёсаў вал крывы,
А на ім такія вілы,
Як у чорта пазуры.

Як пакоціцца калёсы,
Калі конь яе павёз,
То, як дзесяць чарцей босых,
Паварочваюць пракос.

Фёдар Хлябіч
Рыбакі

У НАШЫМ АБ'ЕКТЫВЕ



Абворванне бульбы. *Фота Я. Цялушэцкага.*

ЦІКАВАЯ ЗНАХОДКА

Міхась Васільчык, жыхар вёскі Лука ў гміне Нараўка, араў поле за гумном. Калі скончыў араць „у загон", пачаў араць раз і другі глыбейшую баразну. І тады нешта дзынкнула пад плугам, і пацягнулася адараная жалезная пакрышка ад паўкруглай, як потым аказалася, скрынкі. У сярэдзіне ее былі два невялікія па размерах званы аб колішняя, пэўна, салдацкая, трубка. Добра захаваліся ў гэтай скрынцы асабліва званы, горш трубка (яна распалася на пасобныя часткі). На сценцы трубкі відаць вельмі выразна выцісутыя літаркі надпіса: „175 AUTO CLAIRON „2 E SERIE". На адным са званоў ёсць таксама надпіс: „...ДЕНЕГ НЕ ЖАЛЕЙ, СО МНОЙ ЕЗДИТЬ ВЕСЕЛЕЙ". Аднаго першага слова рыфмаванага двуверша мы не змаглі прачытаць, паколькі пакінула ў гэтым месцы глыбокі след іржа.

Можа хто ведае, якога слова не хапіла?

Ахвотных просім напісаць у рэдакцыю: што ведаеце пра такога роду званы (паглядзіце на здымак). Калі і каму яны маглі быць патрэбны?

Мы дадумваемся, што калісь такія званы служылі войску.

Можа хто знае нейкую тайну гэтых званоў?

Рэдакцыя паведаміла аб цікавай знаходцы лучанскага селяніна ў Вайсковы музей у Беластоку. І цяпер яна ў беластоцкім музеі.



М. Васільчык са сваёй знаходкай.

Тэкст і фота **Я. Цялушэцкага**

І ў Ляшуках дачакаліся

Ляшукі — даволі вялікая вёска ў гміне Нараўка. Моладзь з гэтай вёскі даўно марыла, каб мець у сябе такі клуб, як у Ляўкове або ў Луцэ. Вёска Ляшукі знаходзіцца якраз пасярэдзіне гэтых вёсак. Моладзь чакала. Рэдка калі арганізавала яна канцэрты, аўтарскія сустрэчы, свае сходы аб патанцоўкі ў школе. Адзіным месцам для гэтага роду мерапрыемстваў быў школьны даволі прасторны калідор.

І вось у сакавіку гэтага года да жыхароў вёскі Ляшукі дайшла радасная вестка, што будзе клуб „Рух".

Памяшканне на яго знайшлося ў цэнтры вёскі ў хаце селяніна Аляксея Харкевіча. Ад 12 сакавіка ў ім пачала працаваць Ліля Засім. Неўзабаве ў клуб прывезлі тэлевізар, радыёпрыёмнік, праігравальнік, столікі, крэслы, свежую прэсу, у тым ліку і „Ніву". У клуб пачалі прыходзіць не толькі жыхары Ляшукоў, але і з калоній Старога Ляўкова, з Міхнаўкі і з Дамбровы.

Хаця прайшло мала часу, але ў ляшуцкім клубе „Рух" адбыліся ўжо першыя культурныя мерапрыемствы. У красавіку аўтарскую сустрэчу правёў тут Алесь Барскі. На рэпетыцыі пачалі сюды прыходзіць члены хору, які пачаў працаваць пад кіраўніцтвам Янкі Харкевіча. **(ця)**

Беларуская літаратура

Аляксандар Баршчэўскі

НАШАНІЎСКАЯ ПАРА

ЦІШКА ГАРТНЫ — ЧАСТКА XXIII

Вагантызм. Матыў вагантызму, гэта значыць вандроўніцтва, падарожніцтва, у паэзіі Гартнага вельмі часты. Як вядома, напісаў ён цыкл вершаў „Гарбар на вандроўцы", у якім падарожжы з'ўляюцца адным з галоўных матываў. У сувязі з тым, што вершы гэтага цыкла разгледжаны ў раздзеле „рамесніцка-пралетарскія матывы", не будзем больш да іх вяртацца. Хочам тут толькі адзначыць, што ідэя руху, перамяшчэння з месца на месца, непаседлівасць — гэта пастаянныя атрыбуты большасці вершаў паэта. У гэтым сэнсе амаль усю паэзію Гартнага трэба лічыць антыстатычнай, неспакойнай, дынамічнай.

Зараз хочацца звярнуць увагу на два дагэтуль неразгледжаныя вершы, якія поўнасцю змяшчаюцца ў вагантыстычнай плыні. Да такіх твораў належаць: „Развітанне" і „Бежанцы". Вершы з гэтых твораў напісаны ў 1913, другі ў 1915 годзе. Маем аднак тут дачыненне з вагантызмам не дабравольным, а прымусовым.

У „Развітанні" аўтар апавядае аб маладым хлопцу, які пакідае бацькоўскі дом дзеля пошукаў заробкаў. Усе з героя твора супраць выезду сына з хаты. У гэтым якраз праяўляецца характэрная рыса беларуса — яго прывязанасць да сям'і, да сваёй мясцовасці, да айчыны. Аднак, умовы жыцця ломяць прыроджаную рысу характару. Там, дзе грамадзяне не з'яўляюцца гаспадарамі сваёй краіны, не могуць яны быць гаспадарамі свайго лёсу. Вось гэтая ідэя і з'яўляецца галоўным падтэкстам твора. У вядомым вершы Багдановіча „Эміграцкая песня" герой гаворыць, што ён не пакінуў бы свайго краю, калі б хапала ў ім хлеба. Гэтая фраза магла б быць эпіграфам да верша „Развітанне" Гартнага. Недахоп матэрыяльнай або духоўнай стравы гнаў беларусаў у свет. У такой сітуацыі характэрнымі для сцэн сямейнага развітання? ... нараканне, жаль, слёзы былі з'явай нармальнай. Усё гэта ёсць у „Развітанні". Можам гаварыць, што верш гэты слёзлівы, меладраматычны, сентыментальны. Але ці такія схільнасці не былі характэрнымі для сцэн сямейнага развітання? У нейкай ступені сцэны адпраўкі сына на працу або ў армію нагадвалі сцэны хаўтурныя. Хаўтурны настрой адчуваецца і ў „Развітанні". У вершы ўсё пераканаўчае: і агульны маланак атмасферы, і прычытанні маці, і выказванні бацькі, і дэкларацыя сына.

Характэрнай рысай стылю верша з'яўляецца тое, што аўтар перажыванням і настроям героя падпарадкоўвае стан прыроды.

Другі верш „Бежанцы" звязаны з канкрэтным гістарычным фактам — з першай сусветнай вайной, бо, як вядома, у час вайны сотні тысяч беларусаў пакінулі свае пасяленні і выехалі ў глыбіню Расіі. Аўтар глыбока смутке над тым, што людзі прымушаны пакінуць свае хаты, сваю ўбогую маёмасць, свае гаспадаркі, сваю айчыну. Верш „Бежанцы" мае характар элегіі: усё ў ім сумнае, жаласлівае, безнадзейнае. У вершы няма выразнага пратэсту супраць вайны, ёсць толькі ціхае перакананне. „Бежанцы" — гэта тыпова пацыфістычны твор Гартнага. Верш канчаецца трыма страфамі, якія маюць характар аўтарскай рэфлексіі. Гартны, як народная плачка, звяртаецца да Нёмана, выяўляе свой сумны настрой, аднак у апошняй страфе прабіваецца настрой веры ў будучыню.

Нам судзіў цяжкі лёс жыць
ў ліхія часы,
Працярпелі ўсяго, больш не будзем
цярпець!
Пачнем з вераю жыць, што калісь
будзем мець
Долю шчасную й жыццё поўнае
красы.

У гэтых апошніх радках выяўляецца настрой, характэрны па сутнасці ўсёй лірыцы Гартнага.

З'езд карэспандэнт...

23 мая гэтага года адбыўся
з'езд карэспандэнтаў „Нівы“.
Ацэнку працы карэспандэнта
нулы год зрабіла журналістк
В. Валкавыцкая. Сцвердзіла
рую плённую працу нашых
сяброў, якія з намі „у добрым
рым, у пахвале і крытыцы“.
„Ніва“ шырока адкрыў свае
для ўсіх карэспандэнтаў. У
супрацоўнічала з „Нівай“ 9
якія апублікавалі на працяг
матэрыялы — заметкі, арты
льетоны і т.п. (прозвішчы н
лепшых карэспандэнтаў мы
10 нумары „Нівы“ ад 7 са
года).

В. Валкавыцкая ацаніла
сока працу авангарда карэс
мінулым годзе. 1975 год б
больш плённы ў карэспанд
насці, чым папярэдні год.
ву“ больш асоб і больш бы
лаў. Карэспандэнты з ко
пішуць больш сістэматычна
лідна, увесь час — што а
крэсліла рэдактар — былі
гатоўнасці ўсё вакол сябе
усім пісаць. А жывуць нац
дэнты, як вядома, у гуш
спраў. Яны, публікуючы ў
заметкі і ўвагі, таксама і
памаглі наладзіць шмат уся
Адзначалася таксама жывая
ная сувязь з карэспандэнтамі.

У заканчэнні свайго выступлення В. Валкавыцкая шмат часу прысвяціла заданням карэспандэнтаў „Нівы“ ў бягучым годзе.

Аб інтэрвенцыйнай дзейнасці рэдакцыі расказаў Я. Цялушэцкі.

Затым адбылася жывая і змястоўная дыскусія, у якой свае думкі выказвалі: Ул. Сідарук з Кузавы, Э. Вайсковіч з Гайнаўкі, М. Панфілюк з Дубічаў Царкоўных, Э. Шчасновіч з Шчасновічаў, А. Раманюк з Дубяжына, А. Закройшчык з Нараўкі, М. Матвеюк і М. Няплоха з Бельска і іншыя.

З'езд праходзіў у творчай і сардэчнай атмасферы.

Карэспандэнты ў час з'езду абменьваліся вопытам са сваёй працы. Расказвалі, як знаходзяць весткі для „Нівы“, на якія трапляюць цяжкасці, аб чым напі-
у бліжэйшы час, аб водгуках на
йшлося ім нала-

навян — хлеб надзённы. („Таму, мабыць, і я пачаў пісаць у „Ніву“ і так ужо само па сабе атрымалася, што стаў яе найактыўнейшым карэспандэнтам“).

У заключэнні свайго выступлення Э. Вайсковіч паабяцаў, што нягледзячы на свой пенсійны ўзрост, будзе актыўна, як і дагэтуль, супрацоўнічаць з рэдакцыяй тыднёвіка „Ніва“ і ўдзельнічаць у спаборніцтве на найлепшага карэспандэнта года.


Янка Цялушэцкі
Фота аўтара



Выступае I карэспандэнт года Э. Вайсковіч. Справа — II карэспандэнт года У.Сідарук, злева — III карэспандэнт года М. Панфілюк.

ФАЛЬКЛОР

ВЯСНЯНКА
(огулька)



...ругі наступае,
...ругі наступае,
...ругі наступае,
Касюні пытае:
За цо, Касюлю, за цо,
...цо, Касюлю, за цо,
...кую прычыну?
...кую прычыну,
...кую прычыну?
За малую дітіну.
...і, Ясеньку, ліпку,
...і, Ясеньку, ліпку
...ті на колыбку.
Нэ буду ліпы тяті,
...уду ліпы тяті —
...рывінён дітяті.
Твое, Ясеньку, твое,
... Ясеньку, твое,
...ічэнько такое.
тобіе роділосе,
тобіе роділосе,
...бэ ўдалосе.
тобіе кумы брали,

сідіт Ясенько рочок,

пры тобіе кумы брали —
Ясеньком называлі.

Ад Веры Іванюк, 1910 г. нараджэння, Надзеі Федарук, 1911 г. нараджэння, і Ніны Васілюк, 1934 г. нараджэння, вёска Плёскі гм. Храбалы, запісаў 5 лістапада 1975 г. М. Гайдук. Нотная транскрыпцыя з магнетафоннай стужкі — Людмілы Панько.

З ДЗВЮМА ПРАФЕСІЯМІ

Кім з'яўляецца Васіль Астапковіч? На гэтае пытанне ў Чаромсе адразу атрымаеш адказ. Гэта дзяжурны руху таварнай станцыі. Такі ўжо ён, што калі што-небудзь робіць, дык робіць добра. Ён, як кажуць там, сэрца і душу ўложыць, каб распачатая справа выканана была дакладна. Таму Васіль Астапковіч залічаецца на сваім спецыфічным чыгуначным прадпрыемстве да перадавых людзей.

З'яўляецца ён таксама перадавым гаспадаром ў Чаромхаўскай гміне. Кіраўнік сельскагаспадарчай службы мясцовага гміннага ўпраўлення Рыгор Васілюк хваліць яго:

— Дастаткова прайсціся па полі, каб адгадаць, якія пасевы належаць Васілю Астапковічу. Рунь у яго, як у нікога там, буйная, цёмна-зялёная. Васіль Астапковіч вельмі правільна чаргуе культуры на сваіх зямельных угоддзях, разумна і ў адпаведны час падкормлівае пасевы мінеральнымі ўгнаеннямі, дбае пра высакаякаснае насенне.

Зямля шчодра яго ўзнагароджвае. З аднаго гектара атрымоўвае ён 38-40 цэнтнераў зернавых і 350 цэнтнераў бульбы. Але гэта, апрача добрай апрацоўкі зямлі, вынік высокага ўгнойвання. Выходзіць у Астапковіча 411 кг НПК на адзін гектар. Пакуль што на нашых вёсках яшчэ гэта рэдкасць.

Некалькі год таму назад Васіль Астапковіч заняўся свінагадоўляй, і сёння прадае дзяржаве каля 60 кормнікаў у год, якія, як правіла, класіфікуюцца да першай катэгорыі.

У 1975 годзе Васілю Астапковічу было прызнана ганаровае званне „Майстра жывёльнай прадукцыі“. Гэта чалавек на меру нашых патрэб, на меру нашых часоў. (мх)

ГМІНЫ

У НАЙБОЛЬШАЙ ГМІНЕ

Гміна Гарадок — найбольшая гміна ў Беластоцкім ваяводстве. Займае яна плошчу ў 43 тысячы гектараў. У гміне каля дзвюх тысяч гаспадарак. Ворыўнай зямлі тут 9720 га. Не вельмі яна ўраджайная. 20-21 цэнтнер з 1 га лічыцца тут за добры ўраджай. Праўда, ёсць гаспадары, якія маюць значна лепшыя паказчыкі, але ўсё ж нялёгка ў гэтых умовах дабіцца добрага ўраджаю.

Дзяржаўны фонд зямлі (ПФЗ) у Гарадоцкай гміне налічвае 5 674 га. А яшчэ тры гады таму назад было яго ўсяго некалькі соцень гектараў. Найбольш зямлі здаюць за пенсію жыхары Зубкоў, Баброўнікаў, Коматаўцаў, Навасёлкаў, Меляшкоў.

Загаспадараннем ПФЗ займаюцца ПГР у Валілах, сельскагаспадарчыя прадукцыйныя спулдзельні (РСП) у Лужанах, Зубрах, а таксама спулдзельня сельскагаспадарчых гурткоў (СКР) у Гарадку.

РСП у Лужанах ужо будуе жылыя блокі і аўчарні на 1500 авечак у ваколіцы Баброўнікаў.

Гаспадары-аднаасобнікі апрацоўваюць 12 620 га зямельных угоддзяў. Многія з іх намераны развіваць гадоўлю кароў (гадоўля свіней на задавальняючым узроўні), паколькі ёсць тут для гэтага спрыяючыя ўмовы — з кожным годам прыбывае меліяраваных сенажацяў.

У галіне раслiннай прадукцыі доследныя палеткі вядуць: з жытам — Сяргей Казлоўскі і Юзэф Бурса з Калоднага, ды Павел Майсей са Свіслачан, з яравым ячменем — Юльян Негерыш і Мікалай Нестэрчук з калоніі Мялешкі, з бульбай — Чэслаў Бяляўскі з Вераб'ёў. Усе яны — прыклад іншым сялянам у сваёй вёсцы.

Жыхары з гміны Гарадок кожны год прымаюць актыўны ўдзел у грамадскіх пачынах. Пабудавалі яны добрыя дарогі: з Вераб'ёў у Мастаўляны, з ПГР Валілы ў Случанку, з Меляшкоў на меляшкоўскія хутары.

Сёлета грамадскім чынам яны будуць будаваць стражацкую рамізу ў Гарадку, рамантаваць дарогу з Зубкоў у Зубры і іншыя мясцовыя дарогі.

У гэтым годзе мадэрнізавана дарога з Гарадка ў Міхалова, па якой ходзіць аўтобус ПКС. (ця)

Што новага ў бельскім ГС-е

Праўда, не было такой нерватропкі, як на вёсках сярод сялян у сувязі са спазненнем вясны, але ўсё ж такі... ГС-аўскія ўлады безупынна хвалююцца за будучы ўраджай, за якім, зразумела, скрываецца будучая скупка збожжа. Ды не толькі. Скупка жывёлы таксама стаіць на хісткай кладцы. З кормам можа быць нявесела. Ну, але няма таго дрэннага, каб на добрае не выйшла. Прырода ж не такая бязлітасная, як чалавек. Хваляванні хваляваннямі, а праца працай. А яе было ў ГС-е шмат. Даволі многа было падпісана дагавораў на дастаўку насення. Перш за ўсё — ільну і буракоў. Прывозілі сваім транспартам аж на панадворак патрабавальнікаў. Часта было так, што з-за некалькіх кілаграмаў трэба было спецыяльна гнаць у вёску машыну. А ўсё ж такі, нягледзячы на цяжкасці і розныя праблемы, якія ўзнікалі, справіліся. Развезлі даволі многа, аж каля ста тон ільну і даволі вялікую колькасць бурачанага насення.

Але пакінем веснавыя работы, якія ўжо за намі. ГС мае дасягненні і ў другіх галінах. Вось хаця б план за першыя чатыры месяцы гэтага года. Прыкладам могуць быць паслугі. План выканалі ў 101,6%. Таксама і з прадукцыяй. План — 2 млн. 180 тыс. злотых (разам пякарскія і напітка-прахаладжальныя вырабы) перавысілі на 365 тысяч злотых. Апрача таго, аднавілі восем крам.

Пачынаючы ад мая гэтага года, на плечы ГС-у ўзложана яшчэ больш абавязкаў. Пераняліі яны ад прадпрыемства гандлю пад сваё кіраўніцтва мяшальню паш, новы гандлёвы павільён і склад машын. У сувязі з гэтым павялічацца гадавыя абароты і менш-больш дасягнуць паловы мільярда злотых. Сума, як відаць, вялікая, але бельскі ГС любіць сур'ёзныя справы.

М. Ш.

ВЕР-НЕ ВЕР

Сніцца, што іду я на работу і нясу з сабой маленькага сынка. Прыйшла я туды, а там страшэнны балаган. І неспадзявана я заўважыла, што няма майго сына. Пачала шукаць. У двух пакоях ляжалі маленькія дзеці і жанчыны, як у радзільным доме. М... дзіцяці там не было. Потым ... гасціне, недзе ў незнаёмай х... таксама не было сынка. Пь...

...людзей, але ніхто яго не бачыў. Нейкі незнаёмы мужчына хацеў мне памагчы. Чалавек гэты паказаўся мне вельмі добрым, і пачалі мы разам шукаць, і ўжо мы на ўскраіне горада, дзе старыя дамы. Ідзем вуліцай і бачым: каля хаты сядзіць жанчына і мужчына. Мы наблізіліся да іх. Мужчына выглядаў страшна. У ...

...цукерку. Ідзем мы далей, і я бачу, што ў майго сына сівыя валасы.

Аня з Беластока

Аня! Чакае вас перамена дома ці працы (вы бачылі балаган). У гэтым балагане вы згубілі сына, дык, магчыма, гэта перамена будзе для вас ...

...нах быў бы мужчына, дзякуючы якому вы знайшлі тое, што шукалі: было ў яго адно, ды страшэннае вока. А трэба вам ведаць, што вочы бачыць у іншага сляпымі, касымі, ці наогул нездаровымі — няўдача ў справах, ... крыўда, хвароба ці проста ней... непрыемнасць.

... Сын ваш трымаў у роце цу... дык, бадай, можаце спадзявац... цей, якія прыедуць у сувязі з ... му нешта прывязуць (у сына ... былі сівыя).

Астрон



Дарагое Сэрцайка! Закончыла ... транамічную школу і пайшла пр... у рэстаран афіцыянткай. Тут я ... ёмілася з Валодзем. Звярнуў ён ... ўвагу, прыходзіў некалькі дзён ... і ўрэшце асмеліўся мяне зачапі... прапанаваў спатканне. Я зг... хлопец быў з выгляду не мала... але прыстойны, культурны. Пас... кання яшчэ больш мне спадабаў... чаў ён прыходзіць да мяне ... Многа гаварыў пра сябе, пра н... польную цудоўную будучыню, ... хала і захаплялася. Непакоіла ... тое, што часта прыходзіў выпіў... аднойчы я даведалася, што мо... не халасцяк, а чалавек жанаты і мае двое дзяцей. Я страшэнна знервавалася і пры спатканні сказала аб усім. Спачатку выкручваўся, але я мела грунтоўныя доказы, і ўрэшце ён прызнаўся. Я сказала, каб больш не паказваўся мне на вочы. Не прыйшоў некалькі дзён, а пасля ізноў з'явіўся. І я не выгнала яго. Зразумела, што не змагу з ім парваць, калі будзем у адным горадзе. Адно выйсце — выехаць адсюль. Так і зрабіла. Але ён даведаўся, дзе я працую, і пачаў слаць пісьмы. Я не адпісвала. А аднойчы прыехаў сам. Я яго ўбачыла і зразумела, што не змагу жыць без яго. Прыязджаў надалей, і я ўжо не зважала на нішто. Неўзабаве я зацяжарыла. Сказала яму. Больш не прыехаў. Напісала яму на работу пісьмо — не адказаў. Нарадзіла дзіця. З бальніцы напісала, каб прыехаў, — не з'явіўся. Сэрцайка, як вярнуць мне яго, памажы.

Расчараваная Ніна

Ніна! Валодзя чалавек жанаты, мае дзяцей. Прыемна было яму з табой забаўляцца, але сур'ёзна цябе ён не трактаваў. А ты пакахала яго, даверылася. А калі зацяжарыла, нарадзіла дзіця, стала яму непатрэбнай. І нічога не зробіш. Хоць і цяжка табе, але старайся забыць яго, займіся дзіцём, на яго старайся пераліць сваю любоў. Час гоіць раны. Ты маладая, можа на сцежцы свайго жыцця спаткаеш яшчэ чалавека, годнага тваіх пачуццяў, які будзе табе мужам, а дзіцяці бацькам.

Сэрцайка

ПЫТАННЕ: А. плаціць па 600 зл. у месяц аліментаў на двое дзяцей. Ён з'яўляецца інвалідам III групы і мае гаспадарку, даход якой ацэнены для падатковых мэт у 7.500 зл. Яго пенсія — 1050 зл. у месяц. Гаспадарку сваю ён аддаў брату, тлумачачы, што з'яўляецца няздольным да працы на гаспадарцы. Асталася толькі пенсія, з якой ён не мог бы пражыць пасля заплаты аліментаў. Ці можа ён патрабаваць зніжэння аліментаў?

АДКАЗ: Зніжэнне або павышэнне ўстаноўленых судом аліментаў можна патрабаваць толькі тады, калі б абставіны, якія існавалі ў часе рашэння справы аб аліментах, выразна змяніліся ...

...лад, непаўналетні, які атрымоўвае аліменты, пачынае хадзіць у сярэднюю школу. Можна таксама патрабаваць змены аліментаў, калі матэрыяльная сітуацыя абавязаных плаціць аліменты пагаршаецца або паляпшаецца. У нашым прыкладзе А., які плаціць аліменты, спасылаецца на пагаршэнне яго сітуацыі ў выніку таго, што ён аддаў гаспадарку ў карыстанне брату. Гэта магло б мець значэнне, калі б А. поўнасцю быў няздольны да працы, а паколькі ён з'яўляецца інвалідам III групы, ён мае толькі зменшаную здольнасць да працы і, калі не хоча працаваць на гаспадарцы, павінен знайсці іншую, адпаведную працу. Таму няма асноў, каб патрабаваць зніжэння аліментаў.



Беласток, вуліца Свяркова. З аднаго боку стройныя гмахі інтэрнатаў для студэнтаў Беластоцкага палітэхнічнага інстытута, з другога боку — сапраўдная вясковая клуня, у якой восенню яшчэ адбываліся абмалоты збожжа. Мінулае і сучаснасць Беластока спляліся тут у цесны вузел. Перамагла сучаснасць. Будзе тут студэнцкі гарадок. Клуню прыдзецца разабраць.

Фота **В. Рудчыка**

...к практычных ведаў



...БАВАЦЬ ПРЫ ДАПАМОЗЕ ЦЫБУЛІ


...обрым фарбавальным рэчы... ...оцца чырвоныя лупіны цы... ...на імі фарбаваць светлыя ... ніткі рознымі колерамі: ад ... а да ржава-карычневага. ...ежыць ад колькасці фар... ...рэчыва. Лупіны цыбулі ...рыблізна такая, каб змясці... ...вай каструльцы) трэба за... ...2 літрах вады і адцадзіць. ...намерна намачыць у выва... ...ць каля паўгадзіны, увесь ...аючы. Пасля гэтага выпа... ...адзе з воцатам і развесіць у ...мым месцы. Колеры, якія ...акім чынам, будуць вельмі

РУКАВЫ З ДОЎГІХ ШКАРПЭТАК

Як вядома, бегаючы дзеці хутка і так сама хутка стоптваюць свае шкарпэткі, падкаляноўкі, райстопкі. Стоптваюцца яны ўнізе, а ўверсе ж застаюцца зусім добрыя.

Што рабіць, калі доўгія шкарпэткі-падкаляноўкі (найчасцей з даволі добрага матэрыялу — эласціку, воўны, дык і дарагія) уверсе яшчэ зусім добрыя? Ці варта іх выкідаць? Ні ў якім выпадку! Ашчадная і гаспадарная маці выкарыстае іх абавязкова. А як — гляньце на змешчаны ніжэй малюнак.

Гаспадыня





У сутычках з ворагам рос атрад, мужнелі і гартаваліся яго байцы. Гэта былі лепшыя, перадавыя сыны народу. Яны прынялі ўрачыстую прысягу, якая абавязвала іх змагацца за справядлівасць, за шчасце і волю народу, не шкадуючы сваіх сіл і жыцця.

Першы партызанскую клятву даў Арлоўскі, за ім Ігнат Швайко, Іван Раманчук, Канстанцін Бацечка і іншыя байцы. У верасні вялікай справе і партызанскаму братэрству ўрачыста пакляўся і Іозеф Шаблоўскі — так у атрадзе пачалі называць Муху-Міхальскага.

Імя Мухі-Міхальскага наганяла такі страх на памешчыкаў, паліцэйскіх і асаднікаў, што яны пачалі баяцца нават сваіх афіцэраў. І не выпадкова. Часта партызаны пераапраналіся ў форму паліцэйскіх салдат. Арлоўскі-Аршынаў, Раманчук-Зарэмба, Васіль Корж і Муха-Шаблоўскі — усе яны дасканала ведалі службу ў арміі буржуазнай Польшчы — у такіх выпадках, як правіла, апраналі мундзіры паліцэйскіх ці армейскіх афіцэраў.

Аднойчы, успамінае старажыл вёскі Пашкаўцы Антон Адамавіч Варанец, які добра ведаў у тыя далёкія гады Аршынава і іншых партызан, Аршынаў у форме паліцэйскага афіцэра са сваімі хлопцамі, таксама пераапранутымі ў паліцэйскую форму, сустрэліся з другой, сапраўднай паліцэйскай групай, якая ішла на пошукі Мухі-Міхальскага. Сустрэліся, разгаварыліся пра нялёгкае жыццё-быццё паліцэйскіх. Афіцэр лаяў Муху за тое, што не дае жыцця паліцы, скардзіўся на падначаленых: Мухі дык яны баяцца, а яго, свайго камандзіра, не вельмі.

— Кажаце, не вельмі слухаюцца вас падначаленыя? — здзівіўся Аршынаў.

— Так, адзінае лякарства — бізун. Ён дапамагае мне трымаць у паслушэнстве гэтае быдла, — паказаўшы пальцам на паліцэйскіх і з зайздрасцю пазіраючы на групу падначаленых свайго субяседніка, якія не зводзілі вачэй са свайго камандзіра і, адчувалася, лавілі кожнае яго слова, шчыра прызнаўся афіцэр.

— А я на сваіх падначаленых не скарджуся. Яны мяне слухаюць. Адно слова — і ў міг скруцяць шыю любому ворагу. — Аршынаў павярнуўся да сваіх хлопцаў, падмігнуў ім:

— Узяць паноў паліцэйскіх!

Не паспелі паліцэйскія зразумець, што да чаго, як былі абяззброены партызанамі.

— Вы, відаць, і ёсць Муха-Міхальскі? — крыху ачомаўшыся, спытаў у Аршынава афіцэр.

— А вы, аказваецца, кемлівы, пан афіцэр, — усміхаючыся, адказаў Аршынаў. — Як бы там ні было, але раю адно: ніколі больш не падымайце зброю супроць партызан. Ідзіце з паліцы. А не паслухаецеся, сустрэнемся другі раз — размова будзе іншая. Зразумелі?

— Зразумелі, зразумелі, — дружна адказалі палонныя.

Жыхар вёскі Шыйкі Клецкага раёна Пётр Андрэевіч Шыйко, які ў 1922-1924 гадах служыў у кавалерыйскім палку польскай арміі, расказаў другі эпізод. Неяк летам 1923 года іх эскадрон, які стаяў у Сіняўцы, узнялі па трывозе. Камандзір эскадрона абвясціў, што ў вёсцы Вялікая Калпаніца з'явіўся Муха, яго патрэбна схапіць жывога ці мёртвага. Уляцелі кавалерысты ў Вялікую Калпаніцу, пачалі распытваць жыхароў пра Муху. Ніхто з іх, аказваецца, не бачыў і не сустракаў Муху. Капітан паслаў групу коннікаў на разведку ў Малую Калпаніцу. Неўзабаве яны вярнуліся і старшы групы далажыў камандзіру:

— Мухі там няма і не можа быць. Там маёр з групай салдат знаходзіцца. Яны загадалі перадаць вам вось гэты пакет.

Разгарнуў капітан пакет, дастаў з яго запіску. А ў ёй усяго некалькі слоў: „Муха гуляе па Малой Калпаніцы, а капітан-разява шукае яго ў Вялікай Калпаніцы. З прывітаннем Муха-Міхальскі". Кінуліся кавалерысты ў Малую Калпаніцу, але Мухі, відома, там ужо не было.

Слава яго расла і шырылася, а з вясны 1922 года ўсе групы, усе партыза-

ТРЫБУНА чытачоў

ПАРТЫЙНЫ ЧЫН У ГМІНЕ НАРАЎКА

У чыне ў гміне Нараўка прынялі ўдзел члены партыі, ЗСЛ, ЗСМП, неарганізаваная моладзь і беспартыйныя. Чын быў праведзены ў трох месцах, загадзя падрыхтаваных. І так: ад пачатку будавалі людзі дарогу з Плянты на станцыю, ад Нараўкі да Грушак, таксама падменьвалі падклады і насыпы на чыгунцы ў Семяноўцы. Усе працавалі надта энергічна і добра. Сярод іх былі працаўнікі мясцовых улад, на чале з Юркам Бароўскім і Юзэфам Навіцкім. Са сваімі працаўнікамі працавалі кіраўнікі і дырэктары ўсіх устаноў.

У час пяцігадзіннага чыну жыхары гміны пабудавалі 910 м дарог, адрамантавалі 2 тысячы м чыгуначнага палатна і пасадзілі 2 га лесу. У чыне ўдзел прыняло 527 асоб: 355 членаў ПАРП, 30 членаў ЗСЛ, 45 асоб моладзі і 97 асоб беспартыйных. Ацэньваючы, можна сказаць, што сума 215.500 зл. чыну сведчыць аб актыўнасці гміны і гміннага камітэта ПАРП.

Варта адзначыць і добрую арганізацыю чыну. Мясцовая ГС падвезла бутэрброды і мінеральныя воды, якія кожны мог купіць. Мясцовыя лекары Галіна і Віктар Мацкевічы клапаціліся аб здароўі людзей.

У час падрыхтоўкі чыну 4 асобы ўступіла ў рады партыі.

Аляксандр Закройшчык

КАЛІ БУДУЦЬ?

Едучы аўтобусам ПКС з Нарвы ў Беласток, бачыш, як аўтобусныя прыпынкі стаяць у чыстым полі, дзе няма ніякай будкі. І так па чарзе: у самай Нарве няма ніякай будкі, а пасажыры хаваюцца ва ўпраўленні ГС, або ў шаўца, што на рагу вуліцы. Другі прыпынак — Іванкі. Стаіць у чыстым полі, і там таксама няма будкі. Пасажыраў тут ратуе невялічкі лясок непадалёку ад прыпынку. У Анцутах таксама прыпынак у чыстым полі, да вёскі каля ста метраў, і пасажыры стаяць пад голым небам.

У самай Трасцянцы будынак знаходзіцца каля паштовага будынка, і туды пасажыры пхаюцца, чакаючы аўтобуса, а гэта ж, вядома, не памагае ў працы. У Жыўкове на прыпынку няма дзе схавацца ад дажджу, а зімою ад сцюжы. Вёскі Альшанка і Ахрымавічы пабудавалі сабе будкі грамадскім чынам. І цяпер ім добра. Але прыпынак ПКС Гнецюкі стаіць у чыстым полі, без будкі.

Гэта ўсё прыпынкі, якія ляжаць на дарозе ад Нарвы да Заблудава. Даязджаюць сюдою дзеці ў школу і дарослыя на працу ў Беласток. Як жа часта вымушаны стаяць у чыстым полі, бо ж вядома, што аўтобусы ездзяць нерэгулярна.

Варта гэтую справу падаць пад развагу ўладам ПКС у Беластоку.

М. Лук'янюк

ны атрада Аршынава свае аперацыі праводзілі пад імем Мухі-Міхальскага. Такая тактыка стварыла ўражанне няўлоўнасці Мухі і безнадзейнасці барацьбы з ім, ашаламляла карнікаў і збівала іх з панталыку.

Аперацыі ішлі адна за другой.

У маі 1922 года атрад Арлоўскага заняў вёску Чучэвічы Лунінецкага павета, ачапіў памяшканні паліцэйскага ўчастка, валаснога ўпраўлення і канторы фірмы па распрацоўцы лесу „Агахель". Паліцыя была абяззброена. Усю зброю, форменнае адзенне паліцэйскіх і грошы партызаны забралі. Забралі дакументы, пячатку, грошы і ў валасным упраўленні. Гэта ўсё патрэбна было партызанам у іх барацьбе. Мясцовыя ўлады паведамілі, што аперацыяй кіраваў Муха-Міхальскі.

11 ліпеня 1922 года група з дзесяці партызан захапіла і спаліла маёнтак Добрае Дрэва ў Лунінецкім павеце, які належаў графу Замойскаму. 15 кастрычніка таго ж года партызаны напалі на маёнтак Струга паблізу Століна, разграмілі паліцэйскі ўчастак і ўтрымлівалі маёнтак у сваіх руках два дні. У час аперацыі два паліцэйскія былі забіты, памешчыцкі дом спалены. Партызаны ж без страт адыйшлі ў лес.

(Працяг будзе)

Калі гэта скончыцца?

Будучы ў чаромхаўскім „Паўшэхным" убачыў я такую карціну: адзін кліент дамагаўся, каб прадаўшчыца зважыла буханку хлеба (ён не верыў, што хлеб мае сваю норму — 1,60 кг). Спачатку прадаўшчыца не хацела слухаць аб тым, але калі і я папрасіў, зрабіла гэта. І ўявіце сабе, кліент меў рацыю. Бухачка важыла 1,54 кг, другая — 1,56 кг. Недахоп некалькіх дэкаў хлеба ў адной буханцы — гэта дробязь, скажаце. Сапраўды дробязь! Дзівуецца толькі чалавек, што тых дробязей надта многа ў нашым штодзённым жыцці. Што б не купляў у краме, прадаўшчык імкнецца вас ашукаць на некалькі дэкаў. А мы бачым гэта і маўчым. Калі і знойдзецца нехта адважны і скажа праўду прадаўцу, ці ёсць у нас хтосьці, хто з боку дзівуецца гэтаму чалавеку. Чаму? Ці ж мы вымушаны працаваць на ўсялякага роду нарабаў? То ж яны з нас смяюцца!

Не трэба тлумачыцца, што для гэтых спраў ёсць адпаведныя ўлады, міліцыя. А дзе ж мы? **(ус)**

ВУЧНІ НЕ ЗАБЫЛІ ПРА ВЕТЭРАНАЎ

У астроўскай школе на Сакольшчыне ўсе вучні з'яўляюцца гарцэрамі і зухамі, чаго няма ў ніякай іншай школе ў сакольскай акрузе. З выпадку 31-ай гадавіны заканчэння вайны каля школы адбыўся мітынг вучняў і жыхароў вёскі. Потым школьная дзетвара выслала каляровыя паштоўкі з пажаданнямі здароўя і шчасця ўсім збавідаўцам — барацьбітам за свабоду і незалежнасць. Падзякавала ім за ўдзел у барацьбе.

Гэтае цікавае і карыснае школьнае мерапрыемства арганізавала дырэктар Зоя Юрылік.

Віт

ЗАЛАТЫЯ ГАДЫ НАДЗІ І ВАСІЛЯ ШАПЕЛЯЎ

Надзя і Васіль Шапель зараз жывуць у горадзе Беластоку. Мінула ўжо 11 год з той пары, як яны пераехалі з вёскі Ярылаўка ў горад. Проста хацелі жыць каля сваіх дзяцей.

Абое з'яўляюцца членамі Беларускага таварыства. А ў бягучым годзе Надзя і Васіль святкуюць важны юбілей — Залатыя гады сумеснага жыцця. У жыцці ўсяляк бывала — і добра, і цяжка. Выхавалі шасцёра дзяцей — дзве дачкі і чатырох сыноў. Усе дзеці жывуць і працуюць. Дачакаліся ўжо 17 унукаў і адной праўнучкі.

В. Ш.

Вазьмі здай!

Сяляне, калі толькі могуць, дык пакідаюць цялят на гадоўлю. Але калі ўжо і так многа кароў мае гаспадар, а кармоў няма, тады цяля трэба здаць. А вазьмі здай. Пункт скупкі цялят у Бельску адкрываецца раз у месяц. І выходзіць такая сітуацыя, што цяля трэба гадаваць паўтара месяца, а то і больш. І многія сяляне ў выніку такой арганізацыі проста рэжуць цялят і прадаюць мяса на ўласную руку.

Валянцін Анапюк

СКР у Бельску

СКР у Бельску арганізаваўся ў 1975 годзе. За першы год сваёй дзейнасці выканаў ён усіх паслуг і прадукцыі на суму звыш 40 мільёнаў злотых. Тут працуе зараз 250 працаўнікоў. Гэта стаіць бельскі СКР на адным з першых месц у Беластоцкім ваяводстве. Вядзе ён разнародную дзейнасць: майстэрню рамонтных паслуг, тэхніча-хімічныя паслугі, аддзел будаўніцтва і прадукцыі будаўнічых матэрыялаў, аддзел матэрыялавай гаспадаркі. Сельскагаспадарчая прадукцыя вядзецца на 198,5 га дзяржаўнага фонду зямлі. На 120 га гэтай зямлі растуць кармы для ўласных кормнікаў, якіх ужо гадуюць тут 450 штук.

У будучым плошча земельных угоддзяў павялічыцца. Будуць пабудаваны яшчэ два хлявы на 1000 кормнікаў і адраманціруюцца далейшыя тры хлявы ў былой РСП Праневічы. Разам будзе адкармлівацца ў бельскім СКР-ы каля 4000 кормнікаў. Развернецца таксама гадоўля гусей (8 тысяч штук) і пчол (50 вулляў).

Мікалай Няплоха

КАБ ЧЫСТЫМ І ЗДАРОВЫМ БЫЦЬ

У палове мая ў групе сельскагаспадарчых школ у Бельску закончыўся месяц санітарнай культуры. У ім адбываліся сустрэчы вучняў з лекарамі, паказы фільмаў на санітарныя тэмы, агляды школьных аптэчак, кантроль чысціні ў школе і асабістай гігіены школьнай моладзі і г.д. У вучнёўскай краме праводзіўся продаж мыла і парашкоў для мыцця. Удзел у гэтым мерапрыемстве прыняла ўся школьная моладзь, якая многаму навучылася. Такія месяцы патрэбны не толькі ў школах.

Мікалай Няплоха

КАБ БОЛЬШ СІЛАСАВАЛІ

Пару год таму назад сяляне Крываіцч падзялілі супольны лес і аблогі. Выкарчавалі хмызнякі і засеялі травой. Такім чынам значна пабольшала зялёных угоддзяў. Павялічылася гадоўля малочных кароў і ялавічыны. Крываічы маюць дастаткова траў. Справа ў тым толькі, што мала хто сіласуе. Бо траву ўлетку скошваюць і сушаць на сена. Лепшай справай было б, калі сіласуюць. Варта, каб сельскагаспадарчая служба ў Орлі больш распрапагандавала гэтую справу ў Крываіцчах. Ёсць гаспадары, якія ў год здаюць дзяржаве па восем штук ялавічыны, а трымаючы маладняк, кормяць яго і зімой сенам. Маглі б кармічь кішонкамі!

Іван Кірызюк

Вучнёўскія апрацоўкі

81 асоба з Тэхнікума сельскагаспадарчага рахункаводства ў Бельску і 39 асоб сельскагаспадарчага тэхнікума пісалі перадэкзаменацыйныя апрацоўкі. Аўтары ўмелі іх добра абараніць. У выніку 15 прац. атрымала выдатныя, а 65 прац. добрыя ацэнкі. Працы паказалі, што вучні ўмеюць самастойна думаць і працаваць.

Мікалай Няплоха

ШТО РАБІЦЬ З ЯЙКАМІ?

У Бабіках ёсць крама, у якой стаяць дзве прадаўшчыцы. Але ў гэтай краме не скупляюць яечак. І жыхары Бабікаў і вёсак Мішкіннікі, Часновічы, Занеўшчына і іншых возяць і носяць яечкі ў краму ў Кнышэвічы, Зубрыцу Вялікую, а нават і ў Саколку.

А ці ж крама ў Бабіках не магла б прымаць яечак? Яна ж вялікая, новая, ёсць месца, дзе складаць, і ёсць дзве прадаўшчыцы.

Віт



Вольга Апановіч, Сухінічы (гміна Бабікі). Адказу прыдзецца крыху пачакаць. Справу вашу разглядаюць кампетэнтныя органы.

Пастаянны чытач з Нараўкі. Калі вы перадасце дзяржаве свае 2,5 га зямлі, тады вам належыцца пенсія, не вышэйшая 700 зл. Калі зямля з'яўляецца вашай і жонкі супольнай уласнасцю і вы займаецеся толькі гаспадаркай (да таго вы ў пенсійным узросце), тады вам і жонцы прыслугоўвае не менш чым 600 зл. у месяц.

Я. С., Міхалова. Селянін, які хоча атрымаць пенсію, абавязаны перадаць дзяржаве ўсю сваю зямлю, якая знаходзіць у склад гаспадаркі. Можа ён затрымаць толькі будынкі, бо гэта ўласнасць не датычыць зямлі. Селянін пры жыцці можа згодна са сваёй воляй карыстацца з будынкаў. Можа іх прадаць або падараваць, з тым, што дзяржава мае права купіць першая. Пасля смерці пенсіянераў будынкі пераходзяць на ўласнасць дзяржавы і яна нікому за гэтыя будынкі не дае ніякай сплаты.

М. Салавей, Новая Луплянка (гміна Шымкі). Выйшла, што ваша крытыка беспадстаўная. Тут спасылаемся на адказ, які прыслаў у рэдакцыю дырэктар Ваяводскай паштовай установы ў Беластоку і які вы, пэўна, таксама атрымалі.

(ця)

ДЗЕ? ШТО? КАЛІ?

22 мая 1976 г. а 17.30 ў вёсцы Семяноўка, што ў Нараўкаўскай гміне, Мікалай К., 21 год, з Семяноўкі ехаў „Газам" і на дарозе перакуліўся. Пасажыры Мікалай Ш. і Мікалай М., параненыя, у бальніцы. Шафёру нічога.

Занядбаны прыпынак

Той, хто ездзіць цягніком на лініі Гайнаўка-Белавежа, калі выгляне праз акно на прыпынку ў Нязнаным Бары, заўжды са спачуваннем паківе галавой. Такі тут непарадак.

Першай у вочы кідаецца прыбіральня. У ёй няма дзвярэй, а каб было „смяшней", хтосьці вырваў пару дошак і з задняй сцяны. Відома, такой прыбіральняй не скарыстаешся, лепш ужо ісці ў кусты, якіх тут, на шчасце, хапае. Не прапусцілі вандалы і пачакальні. Задняя сцяна страціла ўжо адну дошку. Глядзець толькі, як пойдуць і астатнія. Доўгі час дапаўняла сумны вобраз зламаная ножка, якая падтрымлівала дошку з назвай прыпынку. Але яе ўжо крыху паправілі.

Трэба сказаць, што гэты прыпынак нейк не мае шчасця да парадку. Яшчэ некалькі гадоў таму назад падарожных страшыў сваім выглядам зруйнаваны будынак пачакальні. Крытыкавалі яго няраз у газеце. І нарэшце быў пабудаваны новы. Але, відаць, ізноў да гэтага самага. Несумненна, патрэбны тут дакладнейшы дагляд службы аховы чыгункі. А ўсё знішчанае трэба неадкладна паправіць.

П. Байко

ГАСПАДАР З ВЁСКІ ПІРАЖКІ

Міхась Алекша з вёскі Піражкі ў Шудзялаўскай гміне — гаспадар, з якога можна браць прыклад. Гаспадарыць ён з сынам на 14 гектарах зямельных угоддзяў. У яго ўсе сельскагаспадарчыя машыны — трактар, снопавязалка, растрасальнік гною і іншыя.

У 1975 годзе законтрактаваў два гектары бульбы, з чаго дзяржаве прадаў 30 тон. Законтрактаваў збожжа, з якога таксама поўнасцю разлічыўся. Гадуе дзве кабылы-маткі. Кожную восень прадае двое жарабят за больш чым 20 тысяч зл. Мае яшчэ 8 штук быдла — 4 дойныя каровы і 4 штукі маладняку. Гадуе шмат свіней.

Віт

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

ДАРОГА Ў ТАПІЛЕЦ

У № 11 з 14 сакавіка апублікавалі мы ліст жыхароў вёскі Тапілец у гміне Турасль Касцельная пра кепскую дарогу, якая робіцца ўжо многа год і не можа дарабіцца. Жыхары вёскі пісалі, што яны маюць нават уласныя вясковыя грошы на заканчэнне гэтай дарогі і дадуць дапамогу, каб толькі крыху яшчэ памагла ім гміна. А гміна адказвае дзіўна, што на грамадскі пачын жыхароў яны не могуць разлічваць. Хтось тут не ў парадку. І думаем, што жыхары вёскі Тапілец адгукнуцца на ніжэй пададзены адказ гміны Турасль Касцельная.

W odpowiedzi na list czytelników zamieszczony w Waszej Gazecie „List o złej drodze" od mieszkańców wsi Topilec wyjaśniam, że drogę Zawady—Topilec w latach 1972—1974 wybudowano na odcinku 4 km, pozostało do zakończenia około 1 km.

Powyższa droga była budowana z kredytów przydzielonych na popieranie czynów społecznych w tym 50% czynu powinno zapewnić miejscowe społeczeństwo bądź to w gotówce poprzez samoopodatkowanie się, względnie świadczyć roboty niefachowe i dostarczenie materiałów miejscowego pochodzenia (żwir, piasek). W latach 1973—74 Urząd Gminy, chcąc kontynuować rozpoczętą budowę drogi w czynie, musiał mobilizować społeczeństwo z terenu całej gminy celem wykonania prac w 50% w czynie. W tym ogólnogminnym czynie na w/w odcinku drogi kilkakrotnie organizowanym wzięły udział tylko jednostki mieszkańców takich wsi jak: Topilec Kolonia i Topilec Wieś. W 1974 r. wieś Topilec otrzymała nagrodę za dobre wyniki w konkursie „Gmina Mistrz Gospodarności" w kwocie ponad 40 000 zł. Urząd Gminy sugerował mieszkańcom przeznaczenie tej kwoty na dalsze kontynuowanie budowy drogi, a pozostałą część kredytów przeznaczy Urząd Gminy. Jednak mieszkańcy przeznaczyli tę kwotę na inny cel gospodarczy.

W 1976 r. Urząd Gminy nie posiada środków budżetowych na zakończenie tego odcinka drogi, a na pomoc mieszkańców w ramach czynu społecznego nie możemy liczyć.

Naczelnik Gminy
Tadeusz Dryl

„Niwa" — Tygodnik RSW „Prasa—Książka—Ruch". Skr. poczt. 149. 15-950 Białystok. TELEFON 2-32-41. Wydawca Przedsiębiorstwo Wydawniczo-Kolportażowe RSW w Białymstoku. PRENUMERATA: Oddziały „Ruchu", urzędy pocztowe i listonosze. Indeks 36911/36671.

Прынцыповы

Я паглядзеў на гадзіннік: наш загадчык спазніўся.

— Са спазненнем, Аркадзь Паўлавіч.

— Дзякуй.. Цьфу! — схамянуўся ён. — Гэта не транспарт, а чорт ведае што. Паўгадзіны чакаў. Потым ехаў на адной назе — для другой у аўтобусе месца не хапіла. І вось, бачыце, крыху спазніўся.

— Гэта не апраўданне, — мякка запярэчыў я. — Не спадзявайцеся на грамадскі транспарт, выходзьце з дому раней.

Слова ў слова я паўтарыў тое, што звычайна кажа нам загадчык... Забеспячэнец Жмоцікаў, кладаўшчыца Збруева і экспедытар Тумбін развілі рады, аднак я трымаўся малайцом...

Працавалі моўчкі і засяроджана.

Неўзабаве я энергічна запратэставаў супраць пасылкі Збруевай па агуркі ў ларок нашым загадчыкам:

— Нядобра, Аркадзь Паўлавіч. Нельга выкарыстоўваць службовае становішча ў карысных мэтах: пераўтвараць дзяржаўнага кладаўшчыка ў хатнюю работніцу.

Загадчык стральнуў вачамі, але падрыхтаваную пад агуркі авоську схаваў.

Працавалі сярдзіта і напружана. Потым Аркадзь Паўлавіч узяў з вешалкі плашч і бачком накіраваўся на выхад.

— Куды трымаеце шлях, калі не сакрэт, — пацікавіўся я, як бы між іншым. — Да абеду яшчэ дзве гадзіны. Вядома, кіраўнік можа распараджацца сам сваім часам, але папярэдзіць перад адыходам каго-небудзь з падначаленых — яго абавязак: раптам спатрэбіцца тэрмінова? І людзі ў пошуках будуць дарма губляць час і псаваць нервы...

Зусім не прывучаны да крытыкі знізу, Аркадзь Паўлавіч пачырванеў і прызнаўся, што да абеду ў аддзеле не з'явіцца, бо атрымаў пумарок да зубапратэзіста...

Не паспеў загадчык грукнуць дзвярамі, як мяне абступілі ўзрушаныя супрацоўнікі.

— Што з табой? — запытаўся ціха Жмоцікаў. — Хворы? Можа, загрыпаваў, тэмпература?

— Альбо сямейныя непрыемнасці? — паспачувала Збруева. — Ці не збіраецеся разводзіцца з жонкай?

— Не, — рашуча заявіў я. — Не збіраюся. Не жадаю папаўняць рады аліментшчыкаў...

Супрацоўнікі знерухомелі ў позе глыбокага роздуму...

— А ўсё ж, што з табою здарылася, як гэта ты асмеліўся крытыкаваць нашага загадчыка? — запыталася кладаўшчыца Збруева.

— Вельмі проста, — адказаў я. — Пераводжуся на другую работу...

В. Гілевіч


ВЫТЛУМАЧЫЎ

Два задрыпанцы лавілі рыбу. Калі яны ўбачылі набліжаючагася інспектара рыбнагляду, адзін з рыбакоў кінуўся наўцёкі. Інспектар дагнаў яго толькі цераз тры кіламетры і патрабаваў прад'явіць білет на права рыбной лоўлі.


Рыбак паказаў.

— Тады чаму ж вы пабеглі, убачыўшы мяне? — здзівіўся інспектар.


— Таму, што ў майго сябра не было такога білета.



...Кажуць, сем разоў адмерай — адзін раз адрэж. Але ён не мераў і не адразаў, а браў цалкам.



ГАРАДСКІЯ ЗАМАЛЁЎКІ



— Сёння цудоўны захад сонца, перадайце ўніз!

ПЛЯТКАРКІ

Пляткарка пляткарку сустрэла —
Ад радасці пасвятлела;
Распытваць пачала:
— Што рабіла? Дзе была?
— На гарод хадзіла.
— Ці бачыла дзіва?
— Плётак ведаю багата,
Не данесці ўсіх да хаты.
Узяла, пытаеш, дзе?
І на градзе,
І за градою,
І на вадзе,
І над вадою,
І пад вярбой,
І на вярбе...
Хочаш — на і табе.

В. Жуковіч

ПАРАДАК

— Мая Гапка так сочыць за парадкам у хаце, што я больш не магу гэтага вытрымаць.

— Ды паслухай, гэта ж дасканала!

— А ты ўяві сабе, што ўстаеш ноччу і ідзеш на кухню папіць вады, а калі праз дзве мінуты вяртаешся, твая пасцель ужо прыбрана.

Без слоў.

ГУМАР З


НЕ ДАВЯРАЕ

— Дзядуля, — пытае хлопец пастуха, — хто гэты масток за ноч разабраў?

— Які? — здзіўляецца дзядуля. — Тут, хлопча, ніякага мастка не было.

— А як жа я, па-вашаму, учора ўвечары на гэтым баку прорвы апынуўся, — кажа хлопец, — калі за мною з суседняй вёскі хлопцы гналіся?





Чаго ў спорце не бывае!

МАРНАТРАЎСТВА

Гутараць дзве мухі.

— Да чаго ж людзі дурныя, — кажа адна. — Трацяць шалёныя грошы на столі і не карыстаюцца імі!

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе К. Яжэмбскай з Імшару, І. Несцярук з Дубіч Царк., К. Шульц з Сяміціч, Г. Манах з Васькоў, Г. Ювзюк з Барысаўкі, М. Пугаэвіч і Г. Вавульскай са Стрыкоў, М. Петрышук і Р. Леўчук з Тыневіч Вялікіх, Н. Нікіцюк са Ступнік, Г. Лук'янюк і І. Касцючук з Кожына, Я. Аніщчук, Я. Апалінскага, Ю. Якімюка і Л. Андрэюка з Зубава, З. Іванюк і Ул. Парфенюка з Трашчотак, Елі, Эвы і Мірка Лукашэвічаў з Беластока змяшчаем песню

Kochaj ile sił

słowa: Andrzej Kudelski
muzyka: Jarosław Kukulski
śpiewa: Waldemar Kocoń

Przez wiele smutnych lat
Narastał problem ten
Choć przykro mówić fakt
Nikt nie chciał kochać mnie

Do astrologa więc
Poszedłem szukać rad
on tylko marszczył brew
i odpowiadał tak

Kochaj, kochaj ile sił
Szczęście dawaj, szczęście bierz
Jeśli kochać będziesz ty
Ciebie ktoś pokocha też

Kochaj, kochaj ile sił
Ciebie też pokocha ktoś
Całym sercem życzę ci
Kochaj i kochanym bądź

Dla potomności dziś
Powtarzam słowa te
co rzekł astrolog mi
gdy nikt nie kochał mnie

Kochaj, kochaj ile sił...

НА ШЫРОКІМ СВЕЦЕ

Начальнік прыйшоў на абед да служачага сваёй фірмы. Яму адчыніла дзверы жанчына.

— Гэта ваша жонка? — ціха спытаў начальнік.

— Ці ж я наняў бы такую брыдкую служанку? — змрочна адказаў гаспадар.

* * *

Падвыпіўшыя лесарубы сядзелі ў карчме і хваліліся адзін перад другім.

— Быў выпадак, калі я за адзін дзень павалілі ўвесь лес у правінцыі Норланд! — кажа адзін.

— Ну і што ж! Вось я аднойчы папрацаваў у Сахары!

— Дык жа там пустыня?!

— Цяпер — так...

* * *

Акуліст пацыенту:

— Вам абавязкова патрэбны акуляры!

— Як жа вы можаце так адразу гаварыць, нават не праверыўшы зрок?

— Я гэта зразумеў, калі вы ўвайшлі да мяне цераз акно...





ГАНГСТЭРЫ І ПАЛІЦЭЙСКІЯ


Дзесяць тысяч паліцэйскіх і агентаў у цывільным прынялі ўдзел у рэйдзе супраць гангстэраў, які праведзен па ўсёй Японіі. Былі злоўлены 1.554 гангстэры, канфіскаваны наркотыкі амаль на паўмільёна долараў і 22 адзінкі агнястрэльнай зброі. „Улоў" невялікі, асабліва калі ўлічыць, што большасць арыштаваных, як паказвае практыка, хутка аказваецца на волі. Тым не менш, паліцыя шырока разрэкламавала аперацыю.

Гэта трэцяя з восені мінулага года аблава. У выніку дзвюх папярэдніх было ліквідавана 37 гангстэрскіх арганізацый. Аднак і гэта — кропля ў моры. Паводле даных той жа паліцыі, у Японіі налічваецца 2.650 гангстэрскіх банд.

НЕ ТОЙ НЯБОЖЧЫК

Багатая і сапселая Маргарэт Грыффітс з паўднёваафрыканскага горада Ледыбрэнта, як і ўсе таўстасумы, якія абжэрліся грашамі, выкінула арыгінальную дурасць: яна завяшчала пахаваць разам з ёю і яе любімы аўтамабіль.

Перадсмяротная воля дурасліваі нябожчыцы наткнулася на сур'ёзную перашкоду. Прадстаўнік магільнікавай адміністрацыі заявіў: „Нашы могілкі толькі для белых". Нябожчыца не падумала над тым, што яе любімая машына была... цёмнага колеру...



Асёл усіх ацэньвае па даўжыні вушэй.